**Г. М. КАНЦАВАЯ**
Брэст, УА «БрДУ імя А. С. Пушкіна»

## МЕТАДЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ВЫВУЧЭННЯ ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ НА І СТУПЕНІ АТРЫМАННЯ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

Фразеалогія змяшчае ў сабе значны адукацыйны, развіццёвы і выхаваўчы патэнцыял. Устойлівыя па сваім складзе і ўзнаўляльныя ў маўленні выразы адрозніваюцца вобразнасцю значэння, маўленне ж чалавека, які добра ведае фразеалогію роднай мовы, не толькі вобразнае, багатае, трапнае і выразнае, але і будуецца хутка і лёгка. Фразеалогія ўзбагачае маўленне вучняў узорамі народна-аўтарскай маўленчай творчасці і палягчае канструяванне ўласнага маўлення. Таму вывучэнне фразеалагізмаў на І ступені атрымання сярэдняй адукацыі – гэта адзін з асноўных сродкаў узбагачэння маўлення вучняў пачатковых класаў.

Устойлівыя адзінкі мовы, з’яўляючыся вынікам працяглага развіцця, фіксуюць і перадаюць з пакалення ў пакаленне грамадскі вопыт, яны важныя не толькі як сродак камунікацыі, але і як крыніца розных грамадска значымых звестак.

Знаёмства з фразеалагізмамі, асэнсаванае іх засваенне, разуменне спецыфікі іх выкарыстання дазваляе значна пашырыць кругагляд вучняў. Самастойны творчы падыход да ацэнкі моўных сродкаў неабходны і таму, што з многімі ўстойлівымі адзінкамі дзец знаёмяцца стыхійна, яшчэ да школы, успрымаючы іх на слых і ў большасці цьмяна здагадваючыся пра іх значэнне з кантэксту. Многія ўстойлівыя адзінкі з яркай эмацыянальнай афарбоўкай нярэдка выкарыстоўваюцца і самімі вучнямі ў маўленні. Наяўнасць значнай колькасці ўстойлівых адзінак у сучасных падручніках для пачатковых класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і іх актуальнасць у маўленчым развіцці вучняў пацвярджае неабходнасць спецыяльнай працы па фразеалогіі на І ступені атрымання сярэдняй адукацыі. Азнаямленне малодшых школьнікаў з устойлівымі адзікамі адбываецца практычным шляхам у працэсе працы над практыкаваннямі і тэкстамі на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання.

Навучанне фразеалогіі складаецца з наступных узаемазвязаных і ўзаемазалежных элементаў: узбагачэнне слоўніка вучняў фразеалагізмамі, яго ўдакладненне і актывізацыя.

Працу па ўзбагачэнні фразеалагічнага запасу вучняў пачатковых класаў неабходна пачынаць з адбору фразеалагізмаў, пры якім неабходна ўлічваць частату выкарыстання фразеалагізмаў у маўленні, адпаведнасць іх таму

вучэбнаму матэрыялу, які вывучаецца на ўроках беларускай мовы і ліаратурнага чытання ў пачатковых класах.

Азнаямленне з фразеалагізмамі прадугледжвае акрэсліванне іх асноўных уласцівасцяў, моўных асаблівасцяў і асаблівасцяў функцыянавання устойлівых адзінак у маўленні.

Вывучэнне асноўных асаблівасцяў фразеалагічных адзінак як задача навучання малодшых школьнікаў заключаецца ў высвятленні функцый гэтых адзінак, іх семантыкі і структуры.

Акрамя гэтага, вывучэнне фразеалагізмаў павінна суправаджацца тлумачэннем іх значэння і дарэчным выкарыстаннем у размове.

Існуюць розныя прыёмы тлумачэння значэння фразеалагізмаў. Большая частка прыёмаў накіравана на стымуляванне самастойнага пошуку вучняў пачатковых класаў: значэнне фразеалагізмаў высвятляецца па малюнку-ілюстрацыі, устанаўліваецца ў працэсе аналізу шэрага фразеалагізмаў і прапанаваных да іх гатовых тлумачэнняў, ажыццяўляецца пошук фразеалагізма па яго значэнні, сэнсу фразеалагізма вызначаецца па фразеалагічным слоўніку.

Тэксты практыкаванняў, якія змяшчаюць інфармацыю пра паходжанне фразеалагізмаў, не толькі дапамагаюць устанавіць значэнне, але і садзейнічаюць асэнсаванню іх вобразнага, метафарычнага кампанента.

Паспяховаму вывучэнню функцыянальнай ролі фразеалагізмаў у мове пісьменніка, іх жыцця ў мастацкім творы і выяўленні самой прыроды фразеалагічных адзінак у значнай меры садзейнічае іх аналіз у тэкстах мастацкіх твораў, з якімі вучні пачатковых класаў знаёмяцца на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання.

З мэтай дарэчнага выкарыстання малодшымі школьнікамі фразеалагізмаў ва ўласных тэкстах настаўнікамі выкарыстоўваюцца наступныя практыкаванні: складанне сказаў і тэкстаў з прапанаваным фразеалагізмам, падбор фразеалагізмаў пэўнай тэматыкі ці адпаведных асноўнай думцы тэксту, падбор і запіс фразеалагізмаў, якія выступаюць у ролі ключавых фраз да тэксту. Як прыём, накіраваны на фарміраванне вобразнага маўлення малодшых школьнікаў, рэкамендуецца выкарыстоўваць параўнанне варыянтаў сказаў з фразеалагізмам і словам-сінонімам.

Адабраны настаўнікам матэрыял павінен быць даступны для разумення і асэнсавання вучнямі пачатковых класаў. Напрыклад, узнікненне фразеалагізма *дым каромыслам* ‘дзе-н. пануе вялікае ажыўленне ці падымаецца шум, беспарадак, сумятня’ звязваецца з даўнім сялянскім бытам, «калі існавалі курныя хаты, г. зн. хаты, якія абаграваліся печкай без коміна. Дым выходзіў праз спецыяльнае акенца або ў дзверы. Калі ў хаце было спакойна, а на дварэ стаяла добрая пагода, дым выходзіў роўным

патокам. Калі ж пачынаўся шум, сумятня, то дым падымаўся каромыслам, г. зн. выбіваўся клубам і пасля перавальваўся дугой» [1, с. 125]. Па форме дыму прадказвалі надвор’е: слупам – ясна; каромыслам – да непагадзі.

Фразеалагізм *спусціўшы рукавы* ‘без належнай стараннасці, абы-як (рабіць што-н.)’ узнік у выніку пераасэнсавання свабоднага словазлучэння [1, с. 351]. Гэты фразеалагізм з’явіўся тады, калі людзі насілі верхняе адзенне з вельмі доўгімі рукавамі. Працаваць, не засучыўшы такія рукавы, было вельмі складана і нязручна

Працуючы над вызначэннем сэнсу фразеалагізма *тачыць лясы (балясы)* ‘займацца пустымі размовамі, пустасловіць’, настаўнік спачатку дае азначэнне слову *лясы* (*балясы*) ‘фігурныя слупкі, якімі ўпрыгожвалі лесвічныя поручні’, расказвае вучням пра тое, што рабіць балясы было няцяжка, таму баляснікі займаліся вясёлымі размовамі, жартавалі, пустасловілі [1, с. 364].

На наступным этапе працы над фразеалагізмамі з мэтай павышэння пазнавальнай актыўнасці вучняў можна прапанаваць для выканання заданні даследчага ці пошукавага характару (напрыклад, напісаць апавяданне пра фразеалагізм (на выбар)).

Цікавым прыёмам працы над фразеалагізмамі з’яўляецца ілюстраванне (вучні ілюструюць на выбар адзін ці некалькі вывучаных на ўроку фразеалагізмаў, што дазваляе ім наглядна ўбачыць, наколькі фразеалагізмы з’яўляюцца лексічна непадзельнымі адзінкамі мовы). Аднак настаўніку тут трэба ўлічваць тое, што не кожны фразеалагізм можна праілюстраваць і не ўсякая ілюстрацыя можа быць удалай для таго ці іншага фразеалагізма. Найбольш падыходзяць для ілюстравання такія ўстойлівыя адзінкі, як *дзе ракі зімуюць, як з гусі вада, вылецела з галавы, павесіць галаву, выйсці з сябе, узяць сябе ў рукі* і інш.

Садзейнічаюць актывізацыі фразеалагічнага слоўніка вучняў наступныя практыкаванні: выбар патрэбнага па сэнсе слова, якое заўсёды выкарыстоўваецца ў складзе фразеалагізма (*купіць ... у мяшку, дуе як ... на крупы*); дапаўненне сказа фразеалагізмам, які падыходзіць па сэнсе (*Міхась быў вельмі ціхім і спакойным хлопцам. Усе гаварылі, што ён ... .*); параўнанне варыянтаў прапанаваных фразеалагізмаў: антонімаў і сінонімаў; «стварэнне» фразеалагізма на аснове сэжэтных малюнкаў і апорных слоў; падрыхтоўка малюнкаў, якія адлюстроўваюць змест фразеалагізмаў; скдаданне і разгадванне крыжаванак, прысвечаных фразеалагізмам; напісанне сачынення з выкарыстаннем пэўных фразеалагізмаў; конкурс на лепшае афармленне вокладкі кнігі аб фразеалагізмах і інш.

Фарміраванне фразеалагічнага слоўніка вучняў адбываецца паспяхова пры захаванні шэрага ўмоў:

– адбору фразеалагічных адзінак з улікам паступовага ўскладнення іх структуры і семантыкі, дзіцячага вопыту, неабходнасці фразеалагічных зваротаў для моўных зносін і пазнання, успрымання і разумення тэкстаў дзіцячай мастацкай літаратуры;

– выкарыстання метадаў і прыёмаў, якія дазваляюць наглядна ўявіць вобразны змест фразеалагічнай адзінкі, якія забяспечваюць супастаўленне прамога і пераноснага значэнняў;

– пашырэнне асацыятыўных сувязяў шляхам паказу магчымых межаў спалучальнасці фразеалагізмаў;

– элементарнага асэнсавання вучнямі ролі фразеалагізмаў у выказванні;

– актывізацыі фразеалагічных адзінак у звязным маўленні і стварэнні ўмоў для шырокага пераносу навыкаў выкарыстання фразеалагізмаў у маўленчую практыку [2].

Такім чынам, праца над фразеалагізмамі робіць звязнае маўленне вучняў пачатковых класаў змястоўным, насычаным, дакладным. Малодшыя школьнікі, тлумачачы шляхам лінгвістычных ці лагічных разважанняў сэнс таго ці іншага фразеалагізма, уключаюцца у актыўную разумовую дзейнасць, задумваюцца над значэннем слоў і выразаў і тым самым павышаюць узровень мысліцельных здольнасцяў.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Лепешаў, І. Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І.Я. Лепешаў. – Мінск : БелЭН, 2004. – 448 с.

2. Мокиенко, В. М. Загадки русской фразеологии / В. М. Мокиенко. – М. : Высш. шк., 1990. – 166 с.